тво древних славян. М., 1981; Беларускі фальклор. Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1. Мінск, 2005. *Т.І.Шамякіна.*

**ЗНО́СКА**, з а ў в а г а, б і б л і я г р а ф і ч н а я с п а с ы л к а, пераклад іншамоўнага тэксту, што размяшчаецца ўнізе паласы і звязваецца з асн. тэкстам спец. знакам (знакам З.). Звычайна афармляюцца шрыфтам меншага кеглю ў параўнанні з асн. тэкстам і аддзяляюцца ад яго прабелам. Як правіла, З. знаходзіцца на той жа паласе, што і фрагмент асн. тэксту, да якога яна адносіцца. З мэтай эканоміі плошчы дапускаецца размяшчаць усе З. да 2 палос тэксту ўнізе толькі правай паласы (унізе толькі апошняй калонкі паласы З. да ўсіх яе калонак), а таксама падаваць З. ўшчыльную адна да адной праз кропку і працяжнік. Калі З. не змяшчаецца на адной паласе, то частку яе пераносяць на наступную і размяшчаюць перад зноскамі гэтай паласы без спец. пазначэння. *Д.В.Дзятко.*

**ЗНО́СКА** Ян (1772, Гродзеншчына — 1833), беларускі эканаміст, перакладчык, філосаф. Вучыўся ў Гал. школе ВКЛ (Віленскі ўн-т), якую скончыў са ступенню д-ра вольных навук і філасофіі. З 1794 настаўнічаў у Гродне. З 1802 ад'юнкт, з 1815 ардынарны праф. Віленскага ўн-та, быў сакратаром у ім. У 1810—23 заг. кафедры палітэканоміі, з 1827 дэкан аддз. маральных і паліт. навук. Па заказе Адукац. камісіі Рэчы Паспалітай пераклаў на польск. мову і выдаў з уласнымі каментарыямі «Логіку» франц. філосафа Э. дэ Кандыльяка (Вільня, 1802). Адзін з першых пазнаёміў сучаснікаў з асновамі паліт. эканоміі, апублікаваў у 1811 пад назвай «Навука эканоміі палітычнай» кароткі выклад класічнай працы шатландскага эканаміста А.Сміта «Даследаванне аб прыродзе і прычынах багацця народаў» (1776). У 1816 выдаў арыгінальную навук. працу «Даследаванне пра палітычную эканомію, яе гісторыю і сістэмы». У 1822 узначальваў к-т па праверцы перакладу Статута ВКЛ 1588 на рус. мову. Чл. Варшаўскага т-ва аматараў навукі.

**«ЗО́ЛАК»**, часопіс. Выдаваўся ў 1933—38 у Вільні на бел. мове. Меў падзагаловак «Орган маладой беларускай сацыялістычнай думкі». Рэд. — А.Аніська. Выходзіў нерэгулярна. Прытрымліваўся ідэйных пазіцый замежнай групы партыі бел. эсэраў і яе «Бюлетэня загранічнай групы Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў». На старонках часопіса змяшчаліся агляды бел. перыёдыкі, інфармацыя пра падзеі ў свеце, новыя кірункі сацыяліст. думкі на Захадзе, творы грамадзянскай лірыкі і інш. Восьмы нумар «З.» цалкам прысвечаны жыццю і дзейнасці бел. грамадска-паліт. і культ. дзеяча Т.Грыба, які памёр 25.1.1938 у Празе. Выйшла 8 нумароў.

**«ЗО́ЛАТА»**, «У з о л а т а», «К а л ь ц о», «П е р с ц е н ь», «П я р с ц ё н а к», беларуская народная гульня. Пашырана ў Беларусі ў некалькіх тыпах, мае мноства лакальных варыянтаў, блізкіх да «золата» («Вугалёк», «Жукавінка», «Бульбачка», «Картоплік», «Скута», «Шкута» і інш.). Гуляюць у розных узроставых групах любой колькасцю ўдзельнікаў і любым складам у памяшканні і на прыродзе. Гульцы садзяцца ў шарэнгу ці кругам і сціскаюць перад сабой (ці на каленях) далоні. Вядучы трымае ў сціснутых далонях «золата» (невял. рэч: пярсцёнак, манетку, цукерку, бульбачку) і, рухаючыся ўздоўж гульцоў, у далоні кожнага кладзе свае далоні, імітуючы перадачу «золата», пры гэтым прыгаворвае: «З кута іду, // Золата нясу. // Адгадайце, баяры, // Дзе золата ззяе». У прыгаршчы аднаго з удзельнікаў ён незаўважна апускае «золата». Завяршыўшы абход, вядучы выгуквае: «Золата, да мяне!» Калі гулец, у руках якога знаходзіцца «золата», на апошніх словах без перашкод пакідае гурт, то ён мяняецца з вядучым месцамі. А калі ж яго ўлавіў сусед, то апошні мяняецца роля-